03-04.05.2018 у дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі” праходзіў **семінар-практыкум для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры «Выкарыстанне кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў пры навучанні беларускай мове і літаратуры».**

Дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт *Святлана Мікалаеўна Захарава* пазнаёміла ўдзельнікаў семінара з асаблівасцямі кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў па беларускай мове і літаратуры. Выкарыстанне творчых заданняў на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры стала тэмай выступлення настаўніка кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа №6 г. Рагачова» *Бедняковай Ірыны Валянцінаўны*. Метадыст упраўлення вучэбна-метадычнай работы дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» *Акушэвіч Андрэй Аляксандравіч* правёў практычныя заняткі па выкарыстанні вучэбных заданняў, накіраваных на развіццё прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў. Падчас гэтых заняткаў разглядаліся у тым ліку прыклады заданняў, якія прапаноўваліся ў межах Міжнароднай праграмы па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў (PISA). Завяршыўся семінар-практыкум круглым сталом, падчас якога ўдзельнікі падзяліліся сваім бачаннем праблем і перспектыў выкарыстання кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў у адукацыйным працэсе і падвялі вынікі мерапрыемства.



**_Акушэвіч А.А.,_**
*метадыст упраўлення вучэбна-метадычнай работы*
*ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»*